На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Народная Воля

№ 92 (214)
Субота, 31 мая 1997 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Сонца

	Усход	Заход
Віцебск	4.28	21.26
Магілёў	4.35	21.18
Гомель	4.40	21.07
Мінск	4.46	21.29
Гродна	5.02	21.42
Брэст	5.11	21.34

Поўня 5 чэрвеня

Параллели

Наравне с президентом и даже "круче"

Проводя пресс-конференцию для отечественных и зарубежных журналистов 28 мая сего года, президент Беларуси Александр Лукашенко рассказал о том, с каким огромным трудом в период обсуждения Устава Союза Беларуси и России ему удалось прорваться на телеканал РТР, чтобы появиться перед массовым телезрителем в передаче "Зеркало" Николая Сванидзе. Глава государства подчеркнул, что в жестко контролируемом эфире ему удалось-таки заполучить 47 минут.

Эти горькие сетования главы государства нашли живой отклик в душе сотрудников "Народной воли". По давней устойчивой традиции журналистов этой газеты в Национальный пресс-центр на улице Октябрьской,5 не пригласили. "Прорываться" туда на свой страх и риск не было смысла. Белорусские кордоны перед неугодными, в отличие от российских, просто неприступны. Вот и выходит, что здешние, не обласканные властью журналисты "круче" самого Александра Лукашенко: их опасаются беспредельно и бессрочно.

В диалоге с президентом участвовала белорусская телепрограмма АТН чуть ли не в полном составе. Привычно красовались у микрофонов представители государственных газет. Имели возможность задать свои вопросы российские, польские, американские репортеры. Царила почти полная свобода слова — за исключением... исключений типа "Народной воли". Как ее политический обозреватель я продолжаю гордиться своей "исключительностью", которая возвышает меня даже над главой государства.

Людмила МАСЛЮКОВА.

Открытое письмо

На днях состоялось заседание Высшего совета белорусской Либерально-демократической партии. Проанализировав особенности сложившейся политической ситуации, Высший совет ЛДП принял решение обратиться с открытым письмом к президенту Республики Беларусь Александру Григорьевичу Лукашенко с просьбой как можно скорее рассмотреть вопрос о роспуске нелегитимного парламента.

Отмечается, что белорусская Либерально-демократическая партия будет ожидать положительного ответа до 3 июля. Начиная со Дня независимости Республики Беларусь, ЛДП планирует начать массовые политические акции своих сторонников в рамках действующего законодательства, всеми доступными формами и методами будет добиваться роспуска существующего нелегитимного парламента.

Президенту Республики Беларусь Лукашенко Александру Григорьевичу

Уважаемый Александр Григорьевич!

Вы не можете не видеть, что происходит в нашей стране. За грубо приукрашенными цифрами статистической отчетности недобросовестные чиновники пытаются скрыть сложившуюся крайне неблагоприятную обстановку в экономике, здравоохранении, социальной сфере. Рушатся основы честного частного бизнеса. Утрачены конструктивные контакты со многими зарубежными странами. Некомпетентные люди, которые десятки лет прислуживали любой власти, продолжающие держаться за свои кресла любыми средствами, не могут сделать ничего положительного для экономики республики, а своими неуклюжими попытками управления страной устаревшими административными методами только дискредитируют наше государство.

У Вас есть огромный потенциал, который дает Вам шанс исправить существующее положение. В 1994 г. Вы были демократическим путем избраны большинством белорусского народа. Как и для любого государственного деятеля, для Вас не должно быть различий между гражданами Республики Беларусь. Каждый имеет право выражать свое мнение, но это отнюдь не значит, что оппозиция есть враг. Все мы — и чиновники, и либерал демократы, и коммунисты, и сторонники БНФ — все мы — белорусский народ, к которому Вы всегда можете обратиться за поддержкой для решения подлинно насущных масштабных задач, стоящих перед молодым белорусским государством.

В окружающем нас мире от Вас ждут серьезных решительных действий. Необходимо отказаться от всего старого, что мешает нормальному процессу построения демократического правового государства и процветающего общества. Необходимо завершить начатую Вами правовую реформу. Распустите нелегитимный парламент, назначьте новые демократические выборы. Отстраните от занимаемых государственных должностей вошедших в Ваше окружение фокусников-иллюзионистов, над которыми смеются во всем цивилизованном мире. В правительстве и Администрации президента РБ должны произойти коренные кадровые изменения, но не по принципу "хороший и лично преданный человек", а по принципу преданности Отечеству, государству и только как следствие — высшему должностному лицу государства.

Уважаемый Александр Григорьевич! Мы живем в такую историческую эпоху, когда каждый день промедления и топтания на месте в конце XX века будет дорого стоить нашему государству в следующем веке. Просим Вас не упустить драгоценное время для энергичных преобразований на благо белорусского народа.

С уважением

по поручению Высшего совета ЛДП
С.ГАЙДУКЕВИЧ,
председатель Либерально-демократической партии Беларуси
Председатель Высшего совета ЛДПБ.

Как инвалиду покрыть расходы на бензин?

Эксперты Министерства социальной защиты настаивают на увеличении инвалидам денежных компенсаций расходов на бензин и транспортное обслуживание. Слово — за правительством.

Главный инспектор по делам инвалидов Минсоцзащиты (участник подготовленного проекта) Рита Сушко в комментарии корреспонденту вестника БелТА "В кабинетах власти" отметила:

— Проект постановления, переданный на утверждение Совета министров, — типовой документ. Но продолжающаяся в республике инфляция требует ежегодной корректировки его основных положений. Главная цель создателей проекта — выработка реальных механизмов, которые позволят обеспечить социальную защиту инвалидов, в том числе и Великой Отечественной войны, вынужденных пользоваться специальными автотранспортными средствами. Ни у кого не вызывает сомнения, что ряду категорий инвалидов, имеющих по медицинским показаниям право на пользование различными транспортными средствами, должна быть предоставлена возможность на льготных условиях реализовать это право. Речь идет об обеспечении ремонта, транспортного обслуживания и приобретении горючесмазочных материалов для автомобилей и мотоколясок. На деле же существующие дотации не покрывают нужд инвалидов, которые не могут передвигаться без помощи автотранспортных средств. Темпы инфляции настолько велики, что требуется помесячная корректировка различных видов денежных выплат, в том числе и на транспортное обслуживание, ремонт и приобретение бензина. Эта реальная ситуация, с которой ежедневно сталкиваемся, не всегда находит понимание в тех случаях, когда приходится ее документально определить и облечь в законодательную форму. Главная проблема, которая постоянно встает перед специалистами Министерства социальной защиты, в том, что приходится выступать в роли вечных просителей. Поэтому в проекте постановления не называются конкретные суммы, предусмотренные для выплаты льгот инвалидам на транспортное обслуживание и расходы на бензин.

В Министерстве социальной защиты выражают уверенность, что разумное решение этого действительно непростого вопроса будет найдено, и инвалиды получат возможность на деле воспользоваться своим правом на передвижение при помощи автомобилей и мотоколясок.

Вестник БелТА "В кабинетах власти".

Прафілактыка?

Усё ведаць аб "снікерсах" і "марсах" зможа кожны грамадзянін Беларусі

Папярэдзіць магчымы ўрон здароўю, жыццю, маёмасці грамадзян, а таксама навакольнаму асяроддзю з-за няправільнага прымянення, захоўвання і утылізацыі тавараў заклікана пастанова Савета міністраў Беларусі, прынятая ў адпаведнасці з Законам "Аб абароне правоў спажыўцоў". Гэтым дакументам забараняецца з 1 кастрычніка 1997 года рэалізацыя на тэрыторыі рэспублікі прадуктаў харчавання і прамысловых тавараў народнага спажывання, якія не маюць інфармацыі на беларускай або рускай мовах.

У святле патрабаванняў, зацверджаных урадам, інфармацыя павінна змяшчаць звесткі аб прадукцыі, назву краіны паходжання і прадпрыемства-вытворцы, пералік асноўных кампанентаў, харчовую каштоўнасць, умовы захоўвання, спосаб прыгатавання і дату вырабу, а таксама іншыя даныя, прадугледжаныя заканадаўствам.

Прадукцыя, завезеная на тэрыторыю нашай краіны па кантрактах, заключаных да прыняцця дакумента, можа рэалізоўвацца да 1 студзеня 1998 года.

У выпадках парушэнняў гэтых патрабаванняў суб'екты гаспадарання будуць аштрафаваны ў памеры 25 працэнтаў ад кошту рэалізаваных тавараў, штраф пойдзе ў даход рэспубліканскага бюджэту.

Тэрэза ХАЮЦІНА, БелТА.

Европу никак "не объедешь"...

Сергей Линг чествует Маршалла на чужой территории

Конец недели белорусский премьер со своей командой провел в Нидерландах и Бельгии. Приятные, согласитесь, места, если учесть высокий уровень жизни двух государств. Как раз в эти дни мировая общественность отмечала пятидесятилетие "плана Маршалла" — глобальной программы возрождения послевоенной Европы. В чествованиях общественного деятеля первым делом приняла участие белорусская правительственная делегация. Таким образом и Сергей Линг отдал должное своему, можно сказать, историческому коллеге, экономисту и стратегу господину Маршаллу — на его территории, поскольку нынешнее процветание стран Бенилюкса основано, в том числе, на успешной реализации знаменитого плана.

У себя дома, в куда более скромных пределах Беларуси, Сергей Линг отвечает за дальнейшее развитие экономики, поскольку перед зарубежным вояжем глава правительства уверенно докладывал президенту и парламенту о значительных позитивных сдвигах, достигнутых республикой за четыре месяца текущего года. Если верить официальной информации, то преодоление кризиса не за горами.

Похваляясь меж собой практически полным отсутствием иностранных инвестиций в белорусскую промышленность, правительственная делегация в Нидерландах и Бельгии, тем не менее, вела переговоры с банкирами и официальными лицами о возможности открытия новой кредитной линии для республики. В этом стоит пожелать Сергею Лингу всяческих удач. Только бы не стал он по возвращении сгоряча и под приятными впечатлениями похваляться грядущим прорывом Беларуси к таким темпам развития, которых не знала разоренная второй мировой войной Европа.

Людмила ВАЛЕНТИНОВА.

Жарт мастака

Без слоў.

Мітынгі

Хто абароніць беспрацоўную маці ў... Дзень абароны дзяцей?

1 чэрвеня ў 15 гадзін на плошчы Якуба Коласа адбудзецца мітынг, прысвечаны Сусветнаму дню абароны дзяцей. Жанчыны беларускай сталіцы і пасланніцы іншых гарадоў збіраюцца галосна заявіць уладам аб правах дзяцей, нагадаць аб цяжкім матэрыяльным становішчы сем'яў, што выхоўваюць па два-тры і больш дзіцяці, аб іх літаральна паўгалодным існаванні. Жанчыны жадаюць закрануць і іншыя вострыя пытанні, якія хвалююць, не даюць бацькам пакою за лёс сваіх нашчадкаў, — гэта і наступствы Чарнобыля, якія накладваюць свой адбітак на стан здароўя, і адсутнасць вітамінізаваных прадуктаў харчавання, і прымусовае размеркаванне студэнтаў у радыяцыйныя раёны, і "шанц" для юнакоў прыняць удзел у ваенных канфліктах на тэрыторыі альбо баку Расіі.

Віталь ЧАВУСКІ.

С 30 мая 1997 года Нацбанком установлены курсы иностранных валют

Единый курс

1 СДР	37.278,77
1 австрийский шиллинг	2.229,45
1 австралийский доллар	20.468,64
1 азербайджанский манат	6,60
1 армянский драм	36,00
10 бельгийских франков	7.601,31
1 болгарский лев	17,01
1 венгерский форинт	146,46
1 голландский гульден	13.944,39
10 греческих драхм	976,72
1 грузинский лари	20.561,00
1 датская крона	4.120,10
1 доллар США	26.730,00
1 ирландский фунт	40.268,76
1 исландская крона	380,93
10 испанских песет	1.852,33
100 итальянских лир	1.581,52
1 казахстанский тенге	353,00
1 канадский доллар	19.363,95
1 кувейтский динар	88.363,64
1 кыргызский сом	1.501,00
1 латвийский лат	46.870,07
10 ливанских фунтов	173,35
1 литовский лит	6.682,50
1 молдавский лей	5.801,00
1 немецкая марка	15.689,38
1 норвежская крона	3.775,69
1 польский злотый	8.366,20
10 португальских эскудо	1.549,66
1 российский рубль	4,60
1 румынский лей	3,77
1 сингапурский доллар	18.692,31
1 словацкая крона	782,25
1 таджикский рубль	63,00
10 турецких лир	1,90
1 туркменский манат	6,40
1 узбекский сум	439,00
1 украинская гривна	14.425,00
1 финская марка	5.202,51
1 французский франк	4.643,20
1 фунт стерлингов	43.718,26
1 чешская крона	817,23
1 шведская крона	3.472,42
1 швейцарский франк	18.819,97
1 экю	30.518,99
1 эстонская крона	1.961,72
10 японских иен	2.297,97
Курс клиринговых валют	
1 $ для расчетов с Кубой	26.730,00
1 $ для рас. с Чех. и Слов.	26.730,00

Информация предоставлена ПКФ "Агентствоя . Владимира Гревцова". Тел./факс (017) 262-16-17.

Ліст да суайчыннікаў

Згуртуемся вакол нацыянальнай ідэі

Беларуская дзяржава і яе народ перажываюць адзін з самых трывожных і драматычных этапаў у сваёй навейшай гісторыі. Наша незалежнасць падвяргаецца штодзённым выпрабаванням і не стала яшчэ гістарычным фактам. Усе шэсць гадоў пасля лёсаносных Віскулёўскіх пагадненняў над нашай зямлёй пастаянна ўюцца дэманічныя сілы, якія пагражаюць яе самастойнасці і вольнасці. Толькі ў кароткую эру Станіслава Шушкевіча было больш-менш спакойна: усе ведалі пра яго высокі беларускі патрыятызм і былі ўпэўнены, што ён да канца будзе клапаціцца аб умацаванні самастойнага жыцця беларусаў і ні пры якіх абставінах не здасць і не прадасць іх зямлю іншым дзяржавам.

Пры Шушкевічу былі зроблены ўпэўненыя крокі да адраджэння нашай старажытнай дзяржавы і вернуты да жыцця з небыцця некалькіх стагоддзяў нацыянальныя сімвалы — герб "Пагоня" і бел-чырвона-белы сцяг, пачалі ўваскрашацца ў памяці народнай нацыянальныя героі і гістарычныя падзеі, што адбываліся на нашай зямлі.

Па законнаму праву пасля шматгадовага ўціску і зняважання была адноўлена ў сваіх правах адзінай дзяржаўнай мовы мова карэннай нацыі — беларусаў. Душа народа — мова — пачала пацiху вырывацца на свабоду, яна паслядоўна і настойліва адчыняла сабе дзверы ў школах, у дзяржаўных установах, у войску, у выдавецтвах, на радыё і тэлебачанні.

Акрыяла духам дэнацыяналізаваная і скалечаная царызмам і пралеткультам нацыянальная інтэлігенцыя.

Нас заўважылі ў свеце, прызналі як раўнапраўны і неад'емны суб'ект міжнароднай супольнасці. У Мінску былі адкрыты пасольствы ўсіх важнейшых дзяржаў свету, у Брэсце і Гродне — консульствы некаторых суседніх дзяржаў. Беларусы пачалі прачынацца, напаўняць сваю дзяржаўнасць сучаснымі атрыбутамі, нацыянальнай формай.

Беларуская нацыянальная ідэя пачала набываць сваю плоць і кроў, яна была дамінантай палітычнага курсу Шушкевіча і яго аднадумцаў. Аднак у гэтым прагрэсіўным патрыятычным курсе ўбачылі вялікую небяспеку ўчарашнія партапаратчыкі, якія складалі пераважную большасць у тагачасным Вярхоўным Савеце. Яны былі выхаваны на грубых прынцыпах "пралетарскага інтэрнацыяналізму", варожа ставіліся да будаўніцтва дзяржавы на нацыянальным грунце і шляхам няхітрых, але выпрабаваных закулісных інтрыг саштурхнулі Шушкевіча з уладнага п'едэстала, і ўся ўлада фактычна сканцэнтравалася ў руках чалавека свайго карпаратыўнага клана — Вячаслава Кебіча.

Усе заўважылі: апошні адышоў ад курсу свайго папярэдніка, але не радыкальна. У нацыянальна-культурным пытанні Кебіч карыстаўся паліятыўнымі мерамі, адраджэнцкія ідэі ён пусціў на самацёк, бо зыходзячы з яго менталітэту і прафесіі тут многае для яго было незразумелым і душэўна няблізкім (Кебіч усё жыццё працаваў на гаспадарчай рабоце, ён інжынер па адукацыі). Будучы ад прыроды разважлівым, Вячаслаў Францавіч, аднак, асабліва не перашкаджаў нацыянальна-вызваленчаму руху і не імкнуўся нанесці яму смяротны ўдар, хоць ён і насіўся з хімерычнай ідэяй "аб'яднання грашовых сістэм Беларусі і Расіі", што стварала пагрозу нашаму суверэнітэту. Выканаць гэтую брудную работу Кебіч пакінуў свайму паслядоўніку — маладому, энергічнаму і малавопытнаму Аляксандру Лукашэнку.

Уварваўшыся на трон у арэоле "нястомнага барацьбіта з мафіяй і карупцыяй", "збавіцеля і месіі", малады і гарачы палітык Лукашэнка скіраваў сваю кіпучую энергію не на барацьбу з крымінальнымі элементамі, не на вырашэнне злабадзённых эканамічных праблем, — ён сканцэнтраваў сваю волю і сілу на выяўленне і разгром сваіх палітычных сапернікаў, якія быццам бы днём і ноччу капаюць для яго дол і перашкаджаюць эфектыўна і эфектна кіраваць дзяржавай.

А паколькі пераважная большасць "ворагаў" з'яўляецца вялікімі патрыётамі Беларусі, выступае за сапраўдную, а не за аперэтачную незалежнасць, за ажыццяўленне нацыянальнай ідэі ў поўным аб'ёме, то Аляксандр Рыгоравіч, скарыстаўшы даверлівасць маладасведчаных у палітыцы выбаршчыкаў у два прыёмы (рэферэндумы 1995 і 1996 гадоў) не толькі пазбавіў сваіх апанентаў і канкурэнтаў улады, але адначасова адкінуў прэч іх лозунгі і сімвалы; гістарычныя сцягі і герб замяніў на герб і сцяг, падобныя на тыя, якія былі ў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы, якія былі распрацаваны і зацверджаны ў 1951 годзе на бюро ЦК КПБ пад кіраўніцтвам яраслаўскага пралетарыя, тагачаснага першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі Мікалая Патолічава (заўважым мімаходзь, што ў той час больш чым з 30 міністраў толькі трэць былі беларусамі). Лукашэнка надаў рускай мове статус дзяржаўнай, што адразу адкінула беларускую дзяржаўную мову на правінцыяльныя задворкі, сумясціў Дзень незалежнасці з Днём вызвалення Мінска 3 ліпеня 1944 года, падабраў пад сябе заканадаўчую, выканаўчую і судовую ўлады, аднаасобна абвясціў прыярытэтнай палітыку максімальнага збліжэння з Расіяй, паказаўшы высокадэмакратычнаму і высокатэхналагічнаму Захаду спіну.

Апазіцыя апынулася ў стане клінічнай смерці. Калі нічога не здарыцца непрадбачанага, то, улічваючы велізарны аб'ём улады ў руках Лукашэнкі і яго эксцэнтрычны характар, апазіцыя не хутка ачомаецца і не будзе мець рэальнай магчымасці ўздзейнічаць на палітычную і эканамічную сітуацыю ў краіне.

Аднак гісторыя — злапамятная штука, і, вядома, яна прад'явіць Лукашэнку іск і за знявагу і разбурэнне першых парасткаў нацыянальнага Адраджэння, і за аўтарытарна-дыктатарскі стыль кіравання і затуханне дэмакратычных працэсаў, і за раскол грамадства. Сваёй безразважнай, сумбурнай палітыкай "бацька" ўмудрыўся расколоць некалі адзіную і маналітную сям'ю беларусаў на варожыя лагеры.

У Святым благавеставанні ад Матфея сказана: "Усякае царства, якое раздзялілася само па сабе, апусцее; і ўсякі горад альбо дом, які раздзяліўся сам у сабе, не ўстаіць".

Амаль за тры гады прэзідэнцкага праўлення Беларусь падышла да ракавой рысы. У грамадстве рэзка ўзрасла палітычная, грамадзянская і сацыяльная напружанасць. Эканоміка — аснова жыцця народа — учэпіста ўтрымліваецца ў жорсткіх руках планава-каманднай сістэмы і працягвае сваё падзенне, нягледзячы на бадзёрыя запэўніванні, што крытычная кропка ўжо пройдзена і наперадзе заззяла святло. Прыпынена будаўніцтва нацыянальнай па форме дзяржавы і яе інстытутаў, усё выразней акрэсліваюцца контуры рэстаўрацыі парадкаў і каштоўнасцей савецкай таталітарнай сістэмы — вернуты да жыцця бэсэсэраўскія сімвалы, ідзе пакланенне былым партыйным правадырам, увасабляюцца ў жыццё камуністычная практыка і ідэалогія.

Беларусь сёння адзіная з усіх новых постсавецкіх дзяржаў, якая захавала сваё ранейшае камуністычнае аблічча па форме і зместу і зацята ўпарціцца стаць на шлях прагрэсіўных пераўтварэнняў. Людзі вымушаны ўсё часцей звяртацца да крайніх форм барацьбы за свае нацыянальныя і сацыяльныя правы — з бел-чырвона-белымі сцягамі, пустымі талеркамі і каструлямі выходзіць на вулічныя дэманстрацыі.

Беларусь трапіла ў міжнародную ізаляцыю. Да малавядомай раней маладой беларускай дзяржавы і яе народа прыцягнута ўвага сусветнай грамадскасці.

Захад рэзка негатыўна адрэагаваў на паліцэйскія прыёмы кіравання Лукашэнкі і не прызнаў легітымнымі (законнымі) яго імправізацыі па прыняццю новай Канстытуцыі і фарміраванню на яе аснове прававой базы. Беларусь занесена ў "чорны спіс" побач з такімі антыдэмакратычнымі дзяржавамі, як Іран, Ірак, Сербія і іншыя. Нам адмовілі ў эканамічнай і фінансавай дапамозе, бо хто, паважаючы сябе, будзе дапамагаць краіне, дзе ўсталявалася неабмежаваная ўлада адной асобы, парушаюцца правы і свабода чалавека, лідэры апазіцыі ратуюцца эміграцыяй, дзе паліцыя збівае дэпутатаў, дзе пагражаюць жыццям рэдактараў і журналістаў няўрадавых газет, ствараюць невыносныя ўмовы для прагрэсіўных выданняў, ушчэмліваюць інтарэсы патрыятычных дзеячаў культуры.

Што нам рабіць? Дзе шукаць выйсце, і ці ёсць яно наогул на гэтым белым свеце? У чым наша збавенне?

Адзінай сілай і сродкам выратавання беларускага народа ад выраджэння і знікнення з гістарычнай арэны, аздараўлення яго і працвітання з'яўляецца **нацыянальная ідэя.** Менавіта яна, **дух народа,** здольная аб'яднаць і згуртаваць нацыю, надаць ёй энергію і сілу. Нацыянальная ідэя — гэта сёння, калі хочаце, наша другая рэлігія, наша Евангелле (няхай даруе Ісус Хрыстос, што ў нас на гэтым цяжкім адрэзку сваёй гісторыі будзе яшчэ адзін кумір, які мы абавязаны насіць у сваім сэрцы).

Нацыянальная ідэя — надпартыйная і надканфесійная, і яна не можа быць прадметам спрэчак і дыскусій у асяроддзі беларусаў, калі яны хочуць захаваць свой этнас і сваю самабытнасць. Дыскусіі можна весці толькі ў адным кірунку — як лепш, паўней і хутчэй яе рэалізаваць. Мы можам насіць у сваіх кішэнях білеты розных партый, не быць ні ў адной партыі, належаць да розных класаў, быць беднымі ці багатымі, праваслаўнымі ці каталікамі, жыць у горадзе ці вёсцы — нацыянальная ідэя для ўсіх нас святая і неаспрэчная.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Даже если Вы подпишетесь на "Народную волю" на один месяц — у Вас есть шанс выиграть ценный приз!

Как Вы, дорогие читатели, помните, прошлой осенью редакция "Народной воли" проводила лотерею среди тех, кто оформлял подписку на первую половину 1997 года. Обладатели "билетов удачи" получили ценные призы — холодильники, телевизоры, магнитофоны, мебельные гарнитуры, кофеварки, спортивный инвентарь и многое-многое другое.

Сейчас идет подписка на вторую половину 1997 года. Редакция опять решила объявить лотерейный розыгрыш, дополнительно включив массу ценных выигрышей. Примите участие! Подписываясь на "Народную волю", Вы имеете шанс выиграть дорогостоящую вещь. Даже если подпишетесь на один месяц.

Не забывайте, что подписка объявлена до 15 июня 1997 года.

Стоимость на месяц — 29 тыс. рублей, на квартал — 87, на полгода — 174 тысячи. Подписаться можно в любом подписном пункте. Наш индекс — 63222. Подробная информация — в приложении к каталогу.

ЛОТЕРЕЯ!

Уважаемые подписчики, вырежьте этот купон, заполните его и отошлите по адресу: **220030, г.Минск, ул.Энгельса, 34а, "Народная воля".** На конверте сделайте пометку "Лотерея".
Авторитетная комиссия определит победителей.

Ф.И.О. ____________________

Адрес ____________________

Внимание!
В розыгрыше участвует один купон. Письма присылайте до 25 июня 1997 г
Призы победителям вручат при наличии подписного абонемента!

О времени проведения розыгрыша редакция сообщит дополнительно.

Ф.СП-1
Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету 6 3 2 2 2 (індэкс выдання)
Народная Воля
Колькасць камплектаў

на 1997 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____ (паштовы індэкс) ____ (адрас)
Каму ____ (прозвішча, ініцыялы)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету 6 3 2 2 2 (індэкс выдання)
Народная Воля

Кошт: падпіскі ____ руб.; пераадрасоўкі ____ руб. Колькасць камплектаў

на 1997 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____ (паштовы індэкс) ____ (адрас)
Каму ____ (прозвішча, ініцыялы)

Народная Воля

31 МАЯ 1997 г.

Ліст да суайчыннікаў

Згуртуемся вакол нацыянальнай ідэі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нацыянальная ідэя — гэта бязмежная любоў да сваёй зямлі, глыбокая павага да ее гісторыі, мовы, традыцый і звычаяў народа.

Нацыянальная ідэя — гэта калі ў нас ёсць нацыянальныя школы, дзеці беларусаў вучацца на роднай мове, а іх бацькі і ў думках не дапускаюць прыняць удзел у рэферэндуме аб наданні ў суверэннай Беларусі дзяржаўнага статусу мове другога народа і другой дзяржавы.

Нацыянальная ідэя — гэта калі вышэйшая дзяржаўная асоба нашай краіны не толькі не зневажае сваю родную мову, а [illegible] карыстаецца ёю і пільна сочыць, каб гэтая мова квітнела і ўзбагачалася, удасканальвалася і пашыралася, [illegible]

Нацыянальная ідэя — гэта калі над Палацам гэтай асобы і Домам урада лунае шматвекавы бел-чырвона-белы сцяг, а на франтонах гэтых дзяржаўных будынкаў вісіць старажытны герб "Пагоня", 700-годдзе якога летась адзначала патрыятычная грамадскасць Беларусі.

Нацыянальная ідэя — гэта калі ўвесь беларускі народ будзе лічыць абарону незалежнасці і суверэнітэту сваёй дзяржавы свяшчэнным і найпершым сваім грамадзянскім абавязкам, а ўсякія прапановы аб аб'яднанні з іншымі дзяржавамі — злачыннымі і шкоднымі.

Можна бясконца доўга напаўняць зместам нацыянальную ідэю, і ў кожнага чалавека, напэўна, знойдуцца свае даклад[illegible]

[illegible] яна ўсё яшчэ знаходзіцца ў летаргічным сне гістарычнага бяспамяцтва, — то гэта, як ні крыўдна, але ж святая праўда. Праўда, пры гэтым трэба заўважыць: каб мы сталі такімі, шмат сіл прыклалі тыя, хто стагоддзямі таптаў Беларусь. Дыягназ пастаўлены абсалютна правільны.

Не ўсе здольныя вылечыцца ад [illegible]

[illegible] раджэнне не супярэчыць хрысціянскім каштоўнасцям, яно дапаўняе і канкрэтызуе хрысціянскае вучэнне ў адпаведнасці з сённяшнімі гістарычнымі ўмовамі.

Ва ўсіх краінах у час нацыя[illegible]

[illegible] го збавіцеля, не адразу пайшлі гуртам за ім. Майсей вытрымаў непрызнанне, недавер і зласлоўе сваіх аднапляменнікаў, і пасля доўгіх гадоў вандравання па спякотнай пустыні, калі адмерла пака[illegible]

[illegible] цесным яднанні вакол **нацыянальнай ідэі,** пабудуем і адстаім сваю дэмакратычную суверэнную дзяржаву.

Мікола ЯРМАШЭВІЧ.

Брэст.

Опыт столетий

Народные приметы

Венец вокруг солнца — к дождю.

Если лучи солнца идут пучком вниз — будет дождь.

В жаркую погоду солнце сильно печет — к грозе или граду, в облачный день печет временами или после дождя — к вечеру будет дождь.

Если при закате солнце бледное или желтое, а утром красное — погода изменится, возможен дождь или ветер.

Во время полнолуния луна светлого и чистого цвета — к хорошей погоде, а темного и бледного — к дождю.

Обильная роса с вечера — к солнечной погоде.

Цветы усиливают запах или раскрывают цветки сильнее обычного — к дождю.

При чистом голубом небе цветы мальвы, эпомеи и календулы (ноготков) сложили свои лепестки — к скорому дождю, календула с утра развернула свои венчики — к ясной погоде, развернула после полудня — к дождю и грозе.

Беларусь — Германія

Мінскі "дэсант" высадзіцца на берагах Рура

У другой палове чэрвеня ў Германію на традыцыйны "Тыдзень міру" накіруецца прадстаўнічая дэлегацыя прыхільнікаў міру нашай краіны. На берагах Рура высадзіцца "дэсант" з Мінска колькасцю каля сарака чалавек. Што ж гэта за мерапрыемства? Якая яго мэта? З такімі пытаннямі наш карэспандэнт звярнуўся да **старшыні Беларускага камітэта міру Івана Кірычэнкі**.

Ён адзначыў, што "Тыдзень міру" праводзіцца ў рамках міжнароднай праграмы "Прымірэнне". Ён пройдзе ў Вестфаліі. Адкрыецца семінарам на тэму: "Праблемы міру, бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе". Дыскусія пойдзе па такіх праблемах: аб месцы і ролі Беларусі і Германіі ў Еўропе, ліквідацыя вынікаў чарнобыльскай трагедыі, пабудова агульнаеўрапейскага дома, роля жанчын у жыцці грамадства і г.д.


Беларускія ўдзельнікі наведаюць прадпрыемствы, фермерскія гаспадаркі, пазнаёмяцца з жыццём нямецкіх сем'яў. Галоўным акордам "Тыдня міру" стануць два мерапрыемствы — малітва ў храме ў дзень пачатку Вялікай Айчыннай вайны, 22 чэрвеня, мітынг і ўскладанне кветак у філіяле Бухенвальдскага мемарыялу, у якім будзе браць удзел і бургамістр нямецкага горада Швертэ.

Склад беларускай дэлегацыі фарміраваўся з актывістаў міратворчага руху. Па просьбе нямецкага боку ў яе ўключаны прадстаўнікі сем'яў, у якіх летась гасцілі актывісты з берагоў Рура. Касцяк дэлегацыі складаюць прадстаўнікі Капыльскага раёна і аб'яднання "Гарызонт", якія летась бралі актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні "Тыдня міру" ў Мінску.

Якая ж галоўная мэта місіі? Адказваючы на гэта пытанне, Іван Кірычэнка зазначыў, што такія сустрэчы ўмацоўваюць давер паміж простымі людзьмі абедзвюх краін, нясуць праўдзівую інфармацыю на Захад аб сітуацыі ў нашай краіне, садзейнічаюць актывізацыі гуманітарнай дапамогі чарнобыльцам.

Васіль КРАЎЦЭВІЧ.

Стоп-кадр



Четвертый год в Малоритском районе работает совместное белорусско-германское предприятие "Бизон", которое занимается выращиванием хмеля. Уже сейчас плантация ценной культуры занимает 20 гектаров. А к 2000 году она расширится до 50 гектаров. В нынешнем году предприятие сможет выпустить 13—15 тонн сырья, которое с удовольствием покупают пивоваренные заводы республики.

На снимках: *При помощи специального приспособления хмелеводы плетут на плантации своеобразную паутину из проволоки, по которой пойдет в рост хмель. Вера Ивановна Рудык четырнадцать лет работает в колхозе "Малоритский". Сейчас она — главный агроном на хмелеводческой плантации.*

Фото Романа КОБЯКА, БелТА.

Творчасць чытачоў

Жадаю...

Удосталь збожжа аратым,
Вечнай трываласці хатам.
Яблыкаў — яблыням, вады — ручаям,
птушкам — садоў, дрэваў — гаям!
буслам — нізоў, травам — лугоў,
палям — каласоў, храмам — душы,
долам — званоў, росам — мяжы,
жывёлам — кармоў, галодным —
харчоў,
машынам — дарог, дарогам —
машын,
букашкам — жыцця, людзям —
вышынь!
Працы — усім!
Долі — усім!
Дабра — для ўсіх!
Вось тады мо й да мяне
Свята ў госці загляне...

Францішка ЯНУШКА.

Гродна.

Спасибо президенту

Правильно! Не нужно превращать выпускной бал в пьянку...

Хочу как подписчица "Народной воли" выразить через вашу газету искреннюю благодарность президенту Республики Беларусь А.Г.Лукашенко.

На последнем родительском собрании было объявлено, что распоряжением Александра Григорьевича учащимся на выпускном вечере запрещено употреблять спиртное. Ошеломляющее объявление — пришлось даже продать вино, купленное заранее.

Может быть, кому-то это и не понравилось, но многие родители, чего скрывать, очень обрадовались этому ценному указанию, потому что дети, хотя и выпускники школы, а пить не умеют, да и кто их, собственно, этому учил. Родители? Школа?

Да и нужно ли вообще пить? Трезвость — вот пример, достойный подражания.

Когда я поделилась новостью о выпускном вечере на работе, один любитель спиртного сказал, что взрослые дети все равно не обойдутся без торжественной рюмки и пить будут под лестницей, в туалетах. Представьте, каким было мое удивление, когда сами одиннадцатиклассники дружно заявили: "Мы рады этому приказу". Так что пусть выпускной бал пройдет хорошо и весело! Можно ведь веселиться и без спиртного.

Валентина КУЛАКОВА,
мать выпускника.

Минск.

"Непричесанные" мысли

Работать на предприятие "за три копейки" я не пойду

Здравствуй, уважаемая редакция!

Пишет вам частный предприниматель из г.Бреста.

Покупая и читая "Народную волю", получаешь дозу свежего воздуха, и, честно говоря, немного легче жить становится в диктаторской Республике Беларусь.

Наш президент, конечно, не любит богатых. Себя я богатым назвать не могу, но с доходов от частного предпринимательства кое-что могу себе позволить.

После проведения референдума и укрепления (мягко говоря) власти А.Лукашенко ожидать каких-либо послаблений в области налогообложения честному предпринимателю, без образования юридического лица, не приходилось.

Однако в данный момент ситуация является парадоксальной. После введения фиксированных ставок для частных предпринимателей некоторое время не существовало проверок на наличие поштучного товара, имеющегося на прилавке. Обязательный отрыв талонов объясняется защитой прав потребителя, с чем я согласен. Санкции за валютные операции, наверное, тоже правильно, хотя чаще всего официально, в банке, купить валюту очень затруднительно. Ее попросту там нет. Если же я уплачиваю фиксированную ставку 15 минимальных зарплат, что в пересчете составляет 85 долларов, то зачем штрафовать меня за не записанный в журнал учета товар? Это просто дополнительная возможность оштрафовать, которая попахивает беспределом на государственном уровне.

Линия Лукашенко прослеживается в политике прессинга на предпринимателей любого уровня. Если дойдет до того, что я и многие другие вынуждены будем прекратить занятия предпринимательством, то, думаю, лучше власть имущим от этого не станет. Работать на госпредприятие "за три копейки" я не пойду, а заработки на уровне Америки или Европы нам еще долго не грозят. Скорее всего, придется убегать из Беларуси и искать работу на чужбине. Может быть, объединение России и Беларуси как-то изменит ситуацию к лучшему. Вот и все. До свидания.

Игорь.

Брест.

Кто есть кто

Александр Лукашенко — достойный преемник Геннадия Зюганова?

На прошлой неделе государственные газеты сообщили, что "за большой вклад в политическую публицистику, борющуюся за социальную справедливость и тесное единение братских славянских народов Республики Беларусь и Российской Федерации", Александру Лукашенко присуждена Международная премия имени Михаила Шолохова. Такое решение приняла комиссия, которую возглавляет российский писатель и общественный деятель Юрий Бондарев.

Казалось бы, Беларусь должна ликовать — такое признание "писательских заслуг" нашего президента. Но... В официальной прессе — никаких комментариев, никаких поздравительных телеграмм. Видимо, не очень выгодно "раздувать" такое "признание" авторитета А.Лукашенко кое-кому в России. Попахивает вовсе не литературой и не высокой публицистикой, а самым настоящим политиканством. Вспомните, лауреатом вышеназванной премии в минувшем году стал не кто иной, как Геннадий Зюганов, лидер Коммунистической партии Российской Федерации. Александр Лукашенко — достойный преемник?

Не знаю, как воспринял своеобразную награду А.Лукашенко, но "Комсомольская правда" на сей счет иронически заметила: "Сучка не захочет, кобель не вскочит" (М.Шолохов. "Тихий Дон")".

Степан КУХАЛЬСКИЙ.

Не стала вядомай актрысы...

Цяжкую страту панесла беларускае тэатральнае мастацтва. 27 мая 1997 года памерла старэйшына коласаўскай сцэны народная артыстка Беларусі Зінаіда Ігнатаўна Канапелька.

Вось вехі яе біяграфіі: нарадзілася Зінаіда Ігнатаўна 25 снежня 1918 года ў г.п.Багушэўску Сенненскага раёна ў сям'і чыгуначніка. Закончыўшы ў 1938 годзе студыю пры тэатры імя Якуба Коласа, іграла спачатку ролі лірычных гераінь: Насцю /"Несцерка" В.Вольскага і "Пяюць жаваранкі" К.Крапівы/, Ганку /"Машэка" Я.Купалы/, Юстыну /"Юстына" Х.Вуайліокі/, Наташу /"Тры сястры" А.Чэхава/, Галю /"Алазанская даліна" К.Губарэвіча, І.Дорскага/.

У сталы перыяд творчасці перайшла на ролі сацыяльных гераінь. Сярод іх: Ганэрылья /"Кароль Лір" У.Шэкспіра/, Елізавета /"Марыя Сцюарт" Ф.Шылера/, Маргарыта /"Адна" С.Алешына/.

Народны гумар, задушэўнасць, адчуванне стылю і жанру твора, высокая танальнасць пачуццяў вызначаюць вобразы, створаныя актрысай у спектаклях беларускага рэпертуару: Лявоніха /"Лявоніха" П.Данілава/, Паліна /"Трыбунал" А.Макаёнка/, Мальвіна /"Несцерка" В.Вольскага/, Загуменная /"Мудрамер" М.Матукоўскага/ і многія іншыя.

Якіх бы персанажаў ні іграла Зінаіда Ігнатаўна — адмоўных, такіх як Разалія Паўлаўна ў "Клапе" У.Маякоўскага, Мара ў "Доктары філасофіі" Б.Нушыча, Ягадка ў "Амністыі" М.Матукоўскага, ці станоўчыя ролі, як Арына Радзівонаўна ў "Верачцы" А.Макаёнка, Міхаліна ў "Трывозе" А.Петрашкевіча, Антаніна ў "Сылгалі богу, сылгалі..." А.Ждана — яе гераіні былі заўсёды жыццёва сакавітымі, высокаартыстычнымі, пераканаўчымі.

Актрыса вялікага душэўнага тэмпераменту, яркай тэатральнай формы, глыбокага псіхалагізму, Зінаіда Ігнатаўна Канапелька стварыла за час работы ў тэатры імя Я.Коласа таксама цэлы шэраг шматгранных характараў у творах рускай і замежнай класікі.

Свой творчы вопыт, прафесійныя набыткі актрыса шчодра перадавала моладзі. Доўгія гады ўзначальвала прафсаюзны камітэт тэатра. На працягу ўсёй сваёй творчай дзейнасці з'яўлялася гарачым прапагандыстам лепшых мастацкіх традыцый коласаўскага калектыву.

Узнагароджана ордэнам "Дружбы народаў", медалямі "За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.", імя Францыска Скарыны, ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Беларусі.

Светлая памяць аб Зінаідзе Ігнатаўне Канапелька, выдатнай актрысе, цудоўным чалавеку, назаўсёды застанецца ў сэрцах аматараў беларускай сцэны.

О власти, совести и чести

ДУНЬКИНА СВАДЬБА,

или История предательства в лицах, пока не названных поименно

На одном из заседаний фракции коммунистов в Верховном Совете депутат С.И.Костян рассказал анекдот о том, как Дунька, выходя замуж, спрашивала у матери совета, как ей вести себя в первую брачную ночь. Закончил свое повествование Сергей Иванович сразившей всех наповал моралью: "Сколько ни дрыгайтесь, а под президента лечь придется". Так он определил для себя выход из той тяжелейшей ситуации, когда президент пошел в лобовую атаку на Верховный Совет.

Что ж, для многих депутатов "дунькина свадьба" состоялась. Лишь немногие пошли на этот "брак" по расчету, с карандашиком в руках расписав для себя все плюсы и минусы и получив заверения в назначении на самые высокие посты. Остальных сломали, изнасиловав, причем самыми изощренными способами.

Прошло уже полгода, с тех пор утихла острая боль от первого предательства тех людей, кого привык уважать за занимаемые ими ранее посты, кто с высоких трибун проповедовал нам высокие принципы коммунистической морали. Но написать обо всем, что происходило в Верховном Совете в октябре — ноябре 1996 года, что происходило с душами, с совестью народных избранников, просто необходимо. Ибо, когда об этом рассказываешь людям, они отказываются верить, они спрашивают: а почему вы об этом не кричали, почему не информировали зарубежных журналистов, если наши отказывались от этом писать? Удивляются, когда узнают, что об этом говорилось в Овальном зале в присутствии прессы. Наверное, разгон Верховного Совета случился бы раньше, если бы в руки депутатов не попал один удивительный документ. Чтобы потом меня не затаскали по судам, чьей рукой на нем были сделаны пометки, я вам не скажу.

